Ракурс. Адкрыццё гісторыка-дакументальнай выстаўкі «Шлях да Перамогі: гістарычныя крыніцы сведчаць», прымеркаванай да 75-годдзя Вялікай Перамогі, адбылося ў галерэі «Атрыум», паведамілі ў НББ. Экспазіцыя складаецца з 30 планшэтаў з фатаграфіямі, дакументамі, фактычнымі данымі, картамі, плакатамі, старонкамі перыядычнага друку, сцягамі і іншымі матэрыяламі аб вызваленчым руху Усходняй Еўропы ад нацызму. Унікальныя матэрыялы, у тым ліку тыя, што доўгі час захоўваліся пад грыфам «зусім сакрэтна», сведчаць пра ход баявых дзеянняў, палітыка-маральны стан армейскіх падраздзяленняў, пра ўзаемадзеянне з мясцовымі органамі кіравання па наладжванні інфраструктуры і мірнага жыцця, пра гуманітарную дапамогу савецкіх салдат мясцоваму насельніцтву, распавялі ў Нацыянальнай бібліятэцы.